# Ніл Гілевіч



І калі б была воля мая на тое — пачаў бы я азбуку менавіта з літары М: як і ўсё на зямлі, усё ў нас пачынаецца з Маці. Усё ад маці, усё з-пад матчынага сэрца... Маці адна, маці незаменная... Маці адна, як і Радзіма.

*Рыгор Барадулін.*

## МАЦІ

Я ўзыходжу на двор,
Я кажу ёй: «Са святам!» —
І цалую знаёмыя родныя вусны,
І бяру пад руку,
І іду з ёй у хату,
Дзе ад прыпечка б’е
Дух гарачы капусны.

Я гляджу ў яе вочы,
Што свецяцца шчасцем,
Гладжу рукі сухія,
Прапахлыя зеллем,
І хілюся да сэрца...
А трэба б упасці
Перад ёю — нядужнай, сівой —
На калені...

Вочы маці!
У доўгія зімнія ночы
Вы над намі
Вясёлымі зоркамі ззялі,
Вы ў нясцерпнай дрымоце
Зліпаліся, вочы,
І ўсё ж усміхаліся нам,
Забаўлялі...



Правообладатель Национальный институт образования

Рукі маці!
Вы ў працы не зналі прынукі[1],
Вы насілі штогод
Мазалі, як бабіны,
Вы аж нылі увечары,
Мілыя рукі,
Спавіваючы нас
Перад сном галубіным.

Сэрца маці!
Наш боль быў тваім,
Не іначай,
Сорам наш
Ты насіла вялізарным горам,
Кропля ж кожная
Радасці светлай дзіцячай
Напаўняла цябе,
Разлівалася морам...

А цяпер ёй —
Адно б на сынка наглядзецца...
Жаль, і горыч, і боль
Мне душу працінае:
Як жа позна,
Як позна — любімыя дзеці —
Мы няўдзячнасць сваю
Разумець пачынаем...

1. Чым вас кранула споведзь сына? Зачытайце радкі, якія сведчаць, што да маці прыехаў ужо дарослы сын.
2. Герой верша напоўнены светлымі пачуццямі, звязанымі з маці. Да прапанаваных паэтычных вобразаў падбярыце адпаведныя вершаваныя радкі і патлумачце іх. Напрыклад: «сэрца маці» — увасабленне дабрыні, спагадлівасці, любові, самаахвярнасці — «Наш боль быў тваім...», «Сорам наш // Ты насіла вялізарным горам...»; «вочы маці» — увасабленне

[1] *Прыну́ка* — прымушэнне.



Правообладатель Национальный институт образования

чысціні, радасці, пяшчоты — ...; «рукі маці» — увасабленне штодзённай непасільнай працы і клопату пра дзяцей — ... .

3. Назавіце вобразна-выяўленчыя сродкі, якія дапамагаюць перадаць сыноўнія пачуцці.
4. Вызначце ролю шматкроп'я ў канцы кожнай страфы.
5. Як вы разумееце наступныя радкі?

   Як жа позна,
   Як позна — любімыя дзеці —
   Мы няўдзячнасць сваю
   Разумець пачынаем...

   Паразважайце, як трэба адносіцца да маці, каб пазбегнуць запозненага шкадавання пра сваю недададзеную любоў.
6. Прыгадайце вершы, прысвечаныя маці. Напішыце паштоўку з цёплымі словамі самаму дарагому чалавеку.

Сакрэты ў паэзіі часта нечаканыя. Адзін з іх — незвычайная сцісласць і разам з тым змястоўнасць паэтычных твораў, шматзначнасць кожнага слова, кожнага гука, нават паўзы ў вершы. Усё тут можа набываць асаблівае значэнне: не толькі думкі, заключаныя ў словах, але і тое, што тоіцца за імі, што не выказваецца, а падразумяваецца. Так узнікае падтэкст.

***Падтэкст*** — спосаб паказу жыццёвай з'явы, падзеі, калі важныя думкі і сэнсы не выказваюцца непасрэдна, адкрыта, а як бы стоены за іншымі словамі, расшыфроўваюцца праз паэтычныя тропы, іншасказальнасць выказванняў, шматзначнасць слоў.

У вершы Ніла Гілевіча «Маці» аўтар апісвае вочы, рукі, сэрца роднага чалавека, яе клопат пра дзяцей, вялікую да іх любоў. Мы ўсведамляем, як сын моцна, бязмежна любіць сваю маці, беражліва захоўвае ў памяці яе светлы вобраз. Даведваемся пра жаль, горыч і боль, якія ўзнікаюць у сэрцы сына ў сувязі з тым, што рэдка бачыўся з маці, мала клапаціўся пра яе, быў няўдзячным за падораную яму вялізную, як мора, любоў. Уважлівае прачытанне твора дазволіць нам засяродзіцца на наступных радках: «А трэба б упасці // Перад ёю — нядужнай, сівой — // На калені...», у якіх аўтар заклікае выказваць глыбокія пачуцці павагі, пяшчоты, адданасці родным людзям пры іх жыцці, пры ўсякай нагодзе, адказваючы любоўю за любоў. «Адно б на сынка наглядзецца...» — мара маці, і ў ёй увасоблены рэдкія сустрэчы, рэдкая радасць ад прыезду сына, шчаслівая магчымасць


Правообладатель Национальный институт образования